УДК 373(476)

# ПОГЛЯД МАГІЛЁЎСКІХ НАСТАЎНІКАЎ ГІСТОРЫІ І ГРАМАДАЗНАЎСТВА НА ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАЙ АДУКАЦЫІ І ПАЗІТЫЎНЫЯ ФАКТАРЫ ПРАЦЫ Ў ШКОЛЕ

**Агееў А. Р.**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)

Анатацыя. У дакладзе на базе адказаў магілёўскіх настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства аналізуюцца галоўныя праблемы беларускай школы: празмерная рэгламентацыя работы дакументамі і справаздачамі; невысокі статус настаўніка; слабая матэрыяльная база школы і яе недастатковае метадычнае забеспячэнне. Таксама канстатуецца, што настаўнікі лічаць духоўныя і сацыяльныя фактары працы самай прывабнай часткай сістэмы школьнай адукацыі Беларусі.

Ключавыя словы: праблемы адукацыі, настаўнікі гісторыі, Магілёў, Беларусь.

The main problem of the Belarusian school report based on the responses of Mogilev teachers of history and social science analyzes: excessive regulation of working documents and reports; the low status of teachers; weak material resources of school and its lack of methodological support. Also states that teachers consider the spiritual and social factors work the most attractive part of the school education system in Belarus.

Keywords: problems of education, history teacher, Mogilev, Belarus.

Настаўнікі, якія праходзілі перападрыхтоўку на курсах павышэння кваліфікацыі ў "Магілёўскім дзяржаўным абласным інстытуце развіцця адукацыі" (2017–2018 гг.), выконвалі вучэбнае заданне, у якім неабходна было вызначыць самыя галоўныя праблемы беларускай адукацыі. На рашэнне задачы давалася сем-дзесяць хвілін, для таго каб настаўнікі сапраўды вылучылі самыя актуальныя праблемы. Іх адказы падаліся нам сімптаматычнымі і вартымі публікацыі. Першыя папярэднія вынікі аналізу адказаў настаўнікаў магілёўскіх школ прайшлі апрабацыю на канферэнцыі "Навукова-метадычнае суправаджэнне павышэння кваліфікацыі педагогаў: вопыт, праблемы, перспектывы" ў 2018 г. [1].

Усяго выканала заданне каля 500 рэспандэнтаў, у тым ліку 95 настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства, з якіх – 63 жанчыны, 32 мужчыны; 12 маюць педстаж да 5 г., 17–15 гг.; 34 – 16–25 гг.; 32 – звыш 25 г. На адкрытае пытанне: "Якія праблемы беларускай адукацыі вы лічыце самымі галоўнымі?" – было атрымана 388 самых разнастайных адказаў, якія мы аб'ядналі ў наступныя групы:

| № | Праблема | Усяго адказаў | % напісаўшых адказ |
|---|---|---|---|
| 1 | Залішняя колькасць дакументацыі, вялікі яе абарот, бюракратызацыя | 54 | 56,8 |
| 2 | Нізкі заробак і статус настаўніка. Няма прэстыжу | 46 | 48,4 |
| 3 | Слабае фінансаванне; матэрыяльная база ўстаноў адукацыі | 45 | 47,4 |
| 4 | Недахопы вучэбных планаў і праграм, іх перагружанасць і частыя змены ў праграмах | 40 | 42,1 |
| 5 | Недахоп метадычнай і спецыяльнай літаратуры, няякасныя падручнікі | 39 | 41 |
| 6 | Перапрацоўкі, непрофільная дзейнасць настаўнікаў | 28 | 29,5 |
| 7 | Працэс навучання, перапоўненыя класы, шосты рабочы дзень | 24 | 25,3 |
| 8 | Няспыннае рэфармаванне школьнай сістэмы | 18 | 19 |
| 9 | Узаемаадносіны і праблемы, звязаныя з вучнямі | 17 | 17,9 |
| 10 | Узаемаадносіны з адміністрацыяй навучальных устаноў, органамі кіравання сістэмай асветы, праверкі. атэстацыі | 16 | 16,8 |
| 11 | Умовы працы, псіхалагічны дыскамфорт у школе, адсутнасць свабоды ў настаўніка | 14 | 14,7 |
| 12 | Узаемаадносіны з бацькамі гадаванцаў і навучэнцаў, нежаданне бацькоў займацца выхаваннем сваіх дзяцей | 14 | 14,7 |
| 13 | Няўвага да беларускай мовы з боку дзяржавы, цяжкасці выкладання беларускай мовы | 5 | 5,3 |
| 14 | Недахоп кваліфікацыі і неабходных кампетэнцый настаўнікаў, якасць іх навучання | 4 | 4,2 |
| 15 | Павелічэнне пенсійнага ўзросту, пенсій па выслузе гадоў | 1 | 1,1 |
| 16 | Іншае | 23 | 24,2 |
| | Усяго 95 апытаных | 388 | 408,4 |

Прасачыць стратыграфію адказаў у залежнасці ад педагагічнага стажу ці ад месца пражывання настаўнікаў не ўяўлялася магчымым з-за малой колькасці рэспандэнтаў у такіх групах і нізкай рэпрэзентатыўнасці адказаў.

На першае месца сярод праблем больш паловы (56,8%) настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства паставілі залішнюю колькасць дакументацыі, вялікі яе абарот, бюракратызацыю сістэмы адукацыі. "За папяровай працай ужо не бачым дзяцей, адсутнічае магчымасць вучыць іх," – з сумам напісала адна з апытаных. Прычым некаторыя настаўнікі адзначылі "непатрэбнасць" шмат якіх дакументаў, якія ім прыходзіцца запаўняць і складаць. "Многа фармальнай работы: справаздачы, справаздачы…", – паскардзілася адна з іх. Адна з апытаных расшыфравала сваю думку, указаўшы на "прававое бяспраўе, падмену міністэрскіх дакументаў мясцовымі", якія кладуцца цяжкім грузам на плечы настаўнікаў.

Другой па важнасці праблемай амаль палова апытаных (48,4%) назвала "нізкі заробак і статус настаўнікаў". "Аўтарытэт прафесіі значна зніжаны", "зніжаны аўтарытэт настаўніка", "заробкі настаўнікаў вымушаюць жадаць лепшага" – дастаткова тыповыя адказы. Як можна зразумець з адказаў магілёўскіх педагогаў, "нізкі прэстыж настаўніцкай працы" і "невысокі статус" настаўніка звязаны з нізкім заробкам работнікаў школ і неабходнасцю выконваць "ненастаўніцкія функцыі". Адметна, што некаторыя з настаўнікаў расшыфравалі прычыну сваёй незадаволенасці заробкамі, напісаўшы не пра іх памеры, а пра іх "неадпаведнасць высілкам". Трэба адзначыць, што абедзве праблемы ў якасці галоўных адзначылі і іншыя настаўнікі вобласці, але настаўнікі-гісторыкі паказалі некалькі (на 5–6%) большую крытычнасць да свайго сацыяльнага статусу, матэрыяльнага становішча і ступені бюракратызацыі сістэмы адукацыі ў параўнанні з іншымі катэгорыямі настаўнікаў [1, с. 216].

Трэцяй праблемай для апытаных уяўляецца "слабае фінансаванне" і стан матэрыяльнай базы ўстаноў адукацыі (47,4%).

Больш за 40% настаўнікаў паскардзіліся на недахопы вучэбных планаў і праграм, іх перагрузку і частыя змены ў праграмах. Амаль столькі ж напісалі пра недахоп метадычнай і спецыяльнай літаратуры або няякасныя падручнікі. З аднаго боку, дастаткова тыповымі з'ўляліся адказы: "праграмы задужа складаныя для вучняў", "праграмы перагружаныя", "не хапае колькасці гадзін для засваення матэрыялу па гісторыі". А з другога боку, адзначалася, што "падручнікі перагружаны залішняй інфармацыяй", некаторыя падручнікі маюць занадта вялікі аб'ём матэрыялу.

Больш крытычна настроеныя настаўнікі адзначылі "глыбокі правінцыялізм беларускай педагагічнай навукі, якая адстае нават ад савецкай", "захапленне моднымі інавацыйнымі тэхналогіямі". Яны напісалі, што праграмы і падручнікі "непаслядоўныя", складаюцца "без уліку ўзроставых асаблівасцей дзяцей",



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

“без уліку змен, якія адбываюцца ў свеце”. Значная частка настаўнікаў упэўнена, што новыя праграмы і падручнікі горшыя за тыя, што выпускаліся 10-15 гадоў таму, а іх думкі і заўвагі, якія выказваюцца пры апрабацыі новых вучэбных дапаможнікаў, фактычна не ўлічваюцца.

Амаль трэцяя частка гісторыкаў (29,5%) паскардзілася на “пераработак і няпрофільную дзейнасць настаўнікаў”: неабходнасць правяраць печы; працаваць за сацыяльных работнікаў, за пажарных, электрыкаў і бухгалтараў; удзельнічаць у мерапрыемствах выканкамаў; займацца падпіскай і работай з шматдзетнымі сем’ямі і г.д. У выніку настаўнікі “займаюцца не сваёй справай”, “выконваюць абавязкі, якія не ўваходзяць у абавязкі настаўніка”, “перагружаны дадатковымі абавязкамі”, “перагружаны непедагагічнай дзейнасцю”. Прычым многія з гісторыкаў лічаць гэта “непавагай да настаўнікаў”, бо “настаўнік пастаўлены ў стан абслугі”.

Кожны чацвёрты (25,3%) настаўнік гісторыі і грамадазнаўства адзначыў як праблему “працэс навучання”, “шосты рабочы дзень”, “вялікую напаўняльнасць класаў” і “аптымізацыю” (закрыццё) школ. Трэба адзначыць, што іншыя катэгорыі настаўнікаў менш звяртаюць увагу на гэтую праблему, з іх толькі 9% паскардзіліся на ўмовы працы, і, па сутнасці, гэтую частку школьнага жыцця нельга было, на іх думку, аднесці да важных праблем [1, с. 216].

Як асобную праблему амаль кожны пяты (19%) вылучыў “непрадуманасць і непаслядоўнасць школьных рэформ”, “няспыннае рэфармаванне школьнай сістэмы”. Таксама былі адзначаны: “спрэчныя рашэнні, якія прымаюцца ў сферы адукацыі”; тое, што “рэформы, як рэвалюцыя, непрымальныя ў адукацыі”; што “рэформа школы праводзіцца дзеля рэформы, без дакладнай мэты”; “рэформы, у якіх, па вялікім рахунку, не многа сэнсу (напачатку адмаўляемся, а праз нейкі час вяртаемся назад)”. У той жа час у якасці праблемы была адзначана і “адсутнасць рэальных рэформ”, “застой у адукацыі”, “адсутнасць самакіравання ў школах” і г.д. Адзін з настаўнікаў адзначыў як праблему частую змену міністраў адукацыі.

Прыемна адзначыць, што праца з вучнямі не з’яўляецца сур’ёзнай праблемай для настаўнікаў гісторыі (17,9%). Амаль усе праблемы, звязаныя з вучнямі, гісторыкі і грамадазнаўцы звялі да “нізкай матываванасці вучняў на вучобу”. Толькі ў адным выпадку быў адзначаны “нізкі сацыяльны статус дзяцей”.

Узаемаадносіны з адміністрацыяй навучальных устаноў, органамі кіравання сістэмай адукацыі, праверкі турбуюць настаўнікаў. Іх адзначыла 16,8% педагогаў, але яны аказаліся не такімі істотнымі праблемамі, як нам падавалася напярэдадні апытання. Вытрымліваць праверкі і наладжваць узаемаадносіны з адміністрацыяй настаўнікі навучыліся. Цяжкасці ва ўзаемаадносінах з органамі кіравання большасць настаўнікаў успрымае як звычайныя вытворчыя пытанні, і адносна нямногія лічаць іх праблемамі. Гэта не азначае, што ў дадзенай сферы няма праблем. Асобныя з педагогаў адзначылі і адміністрацыйны ціск, і бюракратызм, і тое, што “установы адукацыі не маюць самастойнасці”, а “настаўніка ўспрымаюць як простага выканаўцу”, і нават “адміністрацыйнае бязгранічча”.

Пра іншыя ўмовы працы настаўніка, псіхалагічны дыскамфорт у школе, адсутнасць свабоды ў педагогаў напісалі 14,7% настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства. “Падаўленне ініцыятывы настаўніка”, “адсутнасць магчымасці выказваць і адстойваць сваю пазіцыю” таксама турбуе настаўнікаў.

Узаемаадносіны з бацькамі вучняў, нежаданне бацькоў займацца выхаваннем сваіх дзяцей становіцца ўсё большай праблемай для навучальнага і выхаваўчага працэсу. Але яе пазначыла толькі 14,7% тых, хто выконваў заданне. Настаўнікаў у першую чаргу хвалюе, што “бацькі не нясуць адказнасці за ўзровень выхавання сваіх дзяцей”. Адзначалася, што яны маюць “велізарныя правы”, але шмат хто з іх “не выконвае сваіх абавязкаў”.

Іншыя праблемы, адзначаныя настаўнікамі, досыць разнастайныя: зніжэнне колькасці навучэнцаў; адсутнасць практыка-арыентаванай дзейнасці навучэнцаў; тэставая сістэма адзнак; малая колькасць мужчын у школах і недахоп маладых настаўнікаў; вялікая колькасць спаборніцтваў, мерапрыемстваў і г.д., якія толькі адцягваюць увагу ад навучання; навязванне ўдзелу ў разнастайных конкурсах, якія ў большасці выпадкаў выконваюцца самімі педагогамі; “палітычная сітуацыя”, “нізкі ўзровень культуры”, “духоўны крызіс” і інш.

Апытанне дакладна вызначыла і “непраблемы” ў адукацыйнай сферы Беларусі, якія часам нам падаюцца праблемамі, а насамрэч з’яўляюцца інфашумам.

Па-першае, выявілася, што для настаўнікаў дзесяцібальная сістэма не з’яўляецца праблемай. Яе адзначыў толькі адзін настаўнік, які прапанаваў вярнуцца да пяцібальнай сістэмы. Большай праблемай настаўнікі лічаць тэставую сістэму адзнак навучэнцаў, бо “падрыхтоўка дзяцей да тэстаў вядзе да таго, што навучэнцы не ўмеюць выказваць свае думкі”. Пачатак урокаў у школе таксама не з’яўляецца праблемай. Павелічэнне пенсійнага ўзросту і цяжкасць выхаду на пенсію па выслузе гадоў адзначыў толькі адзін (1,1%) з гісторыкаў. Няўвага да беларускай мовы з боку дзяржавы, цяжкасці выкладання беларускай мовы пазначыла толькі пяць (5,3%) апытаных. Гэта праблема больш актуальна для настаўнікаў пачатковых класаў і філолагаў.

Недахоп кваліфікацыі і неабходнай кампетэнцыі настаўнікаў, нізкую якасць іх навучання ў вышэйшых навучальных установах адзначыла толькі 4,2% педагогаў-гісторыкаў. Тым не менш асобныя настаўнікі напісалі пра “слабую практычную падрыхтоўку па вядзенні дакументацыі”, што, магчыма, звязана як з вядзеннем школьнай дакументацыі, так і з фактычным увядзеннем дадатковых не прадугледжаных Міністэрствам адукацыі відаў дакументацыі з-за адзначанай вышэй няпрофільнай дзейнасці настаўнікаў.

Некаторыя настаўнікі паспрабавалі самі зрабіць і агульныя высновы. Так, адна настаўніца напісала літаральна наступнае: “Галоўная праблема беларускай адукацыі – адсутнасць сістэмы, мы не ведаем, чаго мы хочам, што нам патрэбна ўсім.” Другая напісала, што “рашэнне праблем у большасці выпадкаў зводзіцца да напісання папер, якія здымаюць адказнасць са службовых асоб”.

Пасля аналізу вызначаных настаўнікамі праблем беларускай адукацыі стала зразумелым, што трэба адзначыць пазітыўныя фактары, якія дапамагаюць настаўнікам працаваць у школе. На адкрытае пытанне: “Якія пазітыўныя фактары і з’явы ў беларускай адукацыі вы можаце адзначыць?” – мы атрымалі разнастайныя, але недастаткова дакладныя і вызначаныя адказы, якія значна цяжэй было згрупаваць. Адчувалася, што настаўнікам было нялёгка адказаць на гэта пытанне. Яно не было так прадумана, як папярэдняе, пры адказе яны больш разважалі, часам паўтаралі адну і тую ж думку рознымі словамі. Усяго было атрымана 261 адказ, што на 32,7% менш, чым было дадзена адказаў на пытанне аб праблемах у адукацыі. Нам падалося магчымым аб’яднаць пазітыўныя фактары ў наступныя групы:

| № | Пазітыўныя фактары і з’явы: | Усяго адказаў | % напісаўшых адказ |
|---|---|---|---|
| 1 | Любоў да дзяцей, стасункі з моладзю, зарад аптымізму, які дае педагагічная праца | 57 | 60 |
| 2 | Магчымасць самарэалізацыі, самаразвіцця настаўніка | 37 | 38,9 |
| 3 | Умовы працы (вялікі адпачынак летам) | 35 | 36,8 |
| 4 | Творчы падыход да працы, прызванне, любоў да працы ці да свайго прадмета | 31 | 32,6 |
| 5 | Інтэлігентнае асяроддзе, дзелавыя стасункі з калегамі | 16 | 16,8 |
| 6 | Магчымасць бачыць вынікі сваёй працы, аддача дзяцей | 16 | 16,8 |
| 7 | Стабільны заробак | 15 | 15,8 |
| 8 | Псіхалагічны камфорт | 15 | 15,8 |
| 9 | Сацыяльная запатрабаванасць | 13 | 13,7 |
| 10 | Умовы працы: шасцігадзінны працоўны дзень, напалову гібкі графік працы, праца ў памяшканні, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне | 12 | 12,6 |
| 11 | Няма куды дзецца, іншай працы няма | 10 | 10,5 |
| 12 | Іншае | 4 | 4,2 |
| | Усяго 95 апытаных | 261 | 274,7 |

Сярод асноўных пазітыўных фактараў работы ў школе настаўнікі вылучылі на першае месца любоў да дзяцей,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

стасункі з моладдзю, зарад аптымізму, жыццёвы тонус, які дае педагагічная праца (60%). “Побач з дзецьмі адчуваю сябе маладой”; “любоў да дзяцей, ад якіх ідзе зарад энергіі, яны непасрэдныя, ад дзяцей можна шмат чаму навучыцца” – розныя варыянты адказаў, якія тлумачаць важнасць гэтых фактараў. “Я люблю дзяцей, атрымліваю ад іх зарад аптымізму, маладосці, бадзёрасці”, – напісала настаўніца з 45-гадовым стажам.

Вельмі важнымі для настаўнікаў аказаліся магчымасці для самарэалізацыі, што адзначыла амаль 40% настаўнікаў. Магчымасць “развівацца”, “выкарыстаць свой творчы патэнцыял”, “не стаяць на месцы” апынулася ў ліку вельмі каштоўных для настаўнікаў.

Доўгі летні адпачынак некаторыя настаўнікі назвалі “адзіным плюсам” у рабоце педагога, але ў ходзе апытвання гэты фактар апынуўся толькі на трэцім месцы (36,8%).

Амаль кожны трэці адзначыў творчасць педагагічнай працы, любоў да працы ці да свайго прадмета (32,6%). “Жаданне падзяліцца сваімі ведамі і дапамагчы знайсці выпускнікам свой шлях у далейшым жыцці”, – напісала адна з настаўніц.

Інтэлігентнае асяроддзе, магчымасці сацыяльнай і інтэлектуальнай камунікацыі з калегамі вызначыў кожны пяты гісторык (16,8%): “работа ў калектыве з інтэлігентнымі людзьмі”, “стасункі з адукаванымі людзьмі”.

“Магчымасць бачыць вынікі сваёй працы”, “аддача дзяцей”, “гонар за асобных выпускнікоў” – таксама важныя фактары (16,8%) для настаўнікаў. “Атрымоўваю задавальненне ад вынікаў сваёй працы”, – падагульніла адна з настаўніц. “Цікава мець зносіны з навучэнцамі, якія з нецікавых становяцца цікавымі”, – рэзюмавала іншая і дадала: “Цешу сябе надзеяй, што хаця б хто-небудзь узгадае мяне добрым словам”.

Стабільнасць заробкаў і іх гарантаванасць, асабліва ў вёсцы, таксама адзначана настаўнікамі (15,8%). “Для раёна больш менш прыстойны заробак”, “заробак стабільны, хаця і невысокі”, – тыповыя адказы. “Псіхалагічны камфорт” як важны для педагогаў фактар адзначаны ў 15,8% адказаў.

Сацыяльная запатрабаванасць, “адчуванне сваёй неабходнасці”, “жаданне зрабіць нешта важнае”, “жаданне зрабіць свет і грамадства лепшымі” адзначаны ў 13,7% рэспандэнтаў.

Неблагія ўмовы працы, у ліку якіх шасцігадзінны рабочы дзень, “напалову гібкі графік працы”, праца ў памяшканні, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адзначылі 12,6% настаўнікаў. “Больш-менш свабодны графік работы дае магчымасць для падзаработку”, – запісала адна з настаўніц.

Толькі кожны дзясяты настаўнік (10,5%) адзначыў тое, што працуе ў школе па прымусе, бо “няма куды дзецца”, “іншай працы няма”.

Фактары, вызначаныя настаўнікамі, можна аб’яднаць у дзве вялікія групы: сацыяльныя, культурныя, псіхалагічныя фактары – з аднаго боку (199%) і камфортныя ўмовы працы – з другога (65,3%). Такім чынам, можна канстатаваць, што духоўныя і сацыяльныя фактары найбольш трымаюць настаўнікаў у прафесіі.

Як бачна з адказаў настаўнікаў гісторыі і грамадазнаўства, галоўнымі праблемамі беларускай школы яны лічаць: забюракратызаванасць педагагічнага працэсу, залішнюю рэгламентацыю дзейнасці нарматыўна-прававымі дакументамі, справаздачамі, шматлікімі інструкцыямі і лакальнымі актамі; невысокі статус настаўніка; слабую матэрыяльную базу школы і яе недастатковае метадычнае забеспячэнне. Таксама настаўнікі адзначаюць складанасць узаемаадносін з бацькамі школьнікаў, няпростыя ўмовы працы настаўніка, псіхалагічны дыскамфорт у некаторых школах.

Безумоўна, гэтыя высновы – вынік падсумоўвання аднабаковага погляду настаўнікаў унутры сістэмы. Усебаковы аналіз праблем беларускай адукацыі паказаў бы і іншыя меркаванні, інакш бы расставіў акцэнты, а магчыма, і змяніў бы некаторыя высновы.

**Літаратура:**


1. Агееў, А.Р. Праблемы беларускай адукацыі вачыма магілёўскіх настаўнікаў / А. Р. Агееў // Научно-методическое сопровождение повышения квалификации педагогов: опыт, проблемы, перспективы : сборник тезисов IV Республиканской научно-практической конференции. 3 мая 2018 года, г. Могилев / редкол. : М. М. Жудро [и др.] ; под общ. ред. В. Н. Гириной. – Могилев : МГОИРО, 2018. – С. 215–217.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова